Ба 247411

# ДАРОГАМІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

# 100

1.

Ба 247411

Гродзенскі абласны савет Беларускага таварыства
ахховы помнікаў гісторыі і культуры

# ДАРОГАМІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

247411

Бел. 2005

Гродна 1991

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

У падрыхтоўцы зборніка прынялі ўдзел Балбатун А. А., студэнт Гродзенскага медыцынскага інстытута; кандыдаты гістарычных навук Паўлючэнка Н. У., Палуцкая С. В., Сяльверстава С. Я., Стасевіч М. П.

Адказны за выданне **В. Р. Каламіец.**

022010

**Хоць зернейкі засохшымі былі,**
**Усё ж такі жыццёвая іх сіла**
**Збудзіла і буйна ўскаласіла**
**Парой вясенняй збожжа на раллі.**

**М. БАГДАНОВІЧ**

У 1991 годзе мы святкуем 100-годдзе нараджэння самага светлага беларускага паэта — Максіма Багдановіча. Радкі вершаў і паэм, празаічных твораў песняра па-новаму загучалі ў наш час, калі ўздымаецца яшчэ адна хваля беларускага нацыянальнага адраджэння, калі зноў пачалі набіраць жыццёвую сілу зернейкі беларускай нацыянальнай культуры, пасеяныя ў пачатку стагоддзя.

Сёння мы зноў і зноў асэнсоўваем жыццёвы шлях паэта, шукаем новыя факты і матэрыялы, якія дапамаглі б нам глыбей пазнаць асобу беларускага песняра, адзначаем на карце Беларусі мясціны, дзе пабываў паэт, імкнемся прыехаць туды, паспрабаваць убачыць іх вачыма Багдановіча.

Тым, каго хвалюе творчасць аўтара «Вянка» і «Зоркі Вянеры», яго жыццёвы шлях, адрасаваны апублікаваныя ў гэтым зборніку матэрыялы. Чытач даведаецца аб помніках і мясцінах, якія звязаны з імем паэта, пазнаёміцца з некаторымі старонкамі эканамічнага і культурнага стану тагачаснага Гродна, калі тут жыла сям´я Багдановічаў.

Тым, хто шукае арыенціраў на шляху вывучэння жыцця і творчасці Максіма Багдановіча, дапаможа спіс літаратуры, які ўключаны ў зборнік.

БАЛБАТУН А. А.

# ПОМНІКІ І ПАМЯТНЫЯ МЕСЦЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З ЖЫЦЦЁМ І ТВОРЧАСЦЮ БЕЛАРУСКАГА ПАЭТА МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Навуковы кансультант Стасевіч Мікалай Пятровіч, кандыдат гістарычных навук.

Рэцэнзент Брытаў Іван Васільевіч, кандыдат гістарычных навук.

## УСТУП

Імя Максіма Багдановіча ўваходзіць у нашу свядомасць з першых школьных чытанак і застаецца на ўсё жыццё як сімвал гарачай любові да Радзімы і веры ў творчыя сілы народа.

Калі Максім Багдановіч надрукаваў у «Нашай Ніве» свой першы твор — напісаную ў народным духу невялічкую казку «Музыка»,— яму ішоў шаснаццаты год. Яму не было яшчэ і васемнаццаці, калі пасля надрукавання вершаў «Край мой родны! Як выкляты богам...», «З песняй беларускага мужыка», «Вадзянік», яго імя сталі называць услед за імёнамі Янкі Купалы і Якуба Коласа. У дваццаць два гады Максім Багдановіч выдаў «Вянок» — зборнік беларускай класічнай дарэвалюцыйнай паэзіі. Да гэтага ж часу ім былі надрукаваны паасобныя артыкулы, сярод іх «Глыбы і слаі», «За тры гады» — самыя дасканалыя ў беларускай дарэвалюцыйнай крытыцы.

Сваё кароткае жыццё Максім Багдановіч аддаў развіццю беларускай культуры. За дзесяць гадоў тытанічнай работы ён стаў выдатным крытыкам і літаратуразнаўцам, які вызначыў асноўныя шляхі развіцця маладой беларускай літаратуры.

## 1. НАРАДЖЭННЕ МАКСІМА

Нарадзіўся Максім Адамавіч Багдановіч ў 1891 годзе 9 снежня (27 лістапада ст. ст.) у Мінску ў сям ́і педагогаў. Бацька паэта — Адам Ягоравіч Багдановіч (па іншых дакументах Юр ́евіч, Георгіевіч) — паходзіў з прыгонных сялян мястэчка Халопенічы Мінскай губерні. Ён скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю і працаваў настаўнікам у Мінску[1]. Маці Максіма — Марыя Апанасаўна Багдановіч (па бацьку — Мякота, па мацеры — Малевіч) — паходзіла з папоўскага роду. Яна закончыла Санкт-Пецярбургскую земскую настаўніцкую школу, многа чытала, мела літаратурныя здольнасці[2]. Максім быў другім сынам Багдановічаў; 6 сакавіка 1890 года нарадзіўся яго старэйшы брат — Вадзім. Сям ́я ў той час пражывала ў Мінску на Траецкай гары па Аляксандраўскай вуліцы ў драўляным двухпавярховым доме Каркасовіча. Багдановічы жылі на другім паверсе, а на першым паверсе ў той час размяшчалася першае прыхадское вучылішча г. Мінска. У гады Вялікай Айчыннай вайны дом, дзе нарадзіўся паэт, напаткаў лёс многіх іншых дамоў сталіцы Беларусі — ён быў разбураны пры бамбёжцы, на яго месцы пабудаваны дом № 25, а Аляксандраўская вуліца была перайменавана ў вуліцу імя М. Горкага. На гэтым доме ў памяць аб нараджэнні паэта ў сакавіку 1959 года ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

---

[1] Н. Б. Ватацы. Шляхі. Мінск, 1986, с. 108 — 123.
[2] А. Н. Бачыла. Дарогамі Максіма Багдановіча. Мінск, 1983, с. 70 — 82.

## 2. У ГРОДНЕ

Хутка пасля нараджэння Максіма ў сям 'і Багдановічаў здарылася няшчасце. Адам Ягоравіч і Марыя Апанасаўна хварэлі на сухоты, і ў красавіку 1892 года ў бацькі паэта пайшла горлам кроў. Урачы забаранілі Адаму Ягоравічу працаваць у школе і ён быў вымушаны шукаць новую пасаду[1]. Адам Ягоравіч прасіў аб назначэнні ў Мінскае аддзяленне банка, яму абяцалі, але вакансія была заменена стаўленікам загадчыка аддзялення, а Адаму Ягоравічу запрапанавалі ехаць у Гродна. Такім чынам, у чэрвені 1892 года сям 'я Багдановічаў з яшчэ зусім малым Максімам пераехала ў Гродна і пасялілася на Новым Свеце[2] па вуліцы Садовай[3], заняўшы кватэру ў прасторным, светлым, чыстым двухпавярхо- вым драўляным будынку. Дом у той час быў размешчаны каля маёнтку Станіслававa. Вакол дома было шмат садоў, недалёка былі лес і Нёман.

У Гродне Адам Ягоравіч пачынае службу ў аддзяленні Сялянскага банка, дзе ён вёў усё справаводства і камяральныя ацэнкі зямлі[4]. Апрача гэтага бацька паэта супрацоўнічаў у неафіцыйнай частцы «Губернских ведомостей» і быў выбраны на пасаду дырэктара народнай бібліятэкі[5]. Ко- ла знаёмых у сям 'і Багдановіча было невялікае: урачы, некаторыя настаўнікі, афіцэры. У госці хадзілі рэдка — не хапала часу, але ў сябе Багдановічы праводзілі цудоўныя вечары, на якіх можна было сустрэць значную частку творчай інтэлігенцыі горада Гродна. Да гэтага часу адносіцца публікацыя апавядання Марыі Апанасаўны ў газеце «Гродненские губернские ведомости» за 29 снежня 1893 года пад назвай «Накануне рождества», у якім апісваецца цяжкі лёс беднай жанчыны-прачкі і яе дзяцей. Гэта апавяданне з 'явілася першым, а зараз і астатнім пацвярджэннем літаратурных здольнасцей маці паэта[6]. Аб актыўным удзеле Адама Ягоравіча ў культурна-асветніцкай дзейнасці горада сведчыць тое, што ён у 1893 годзе стаў прадстаўніком таварыства драматычных пісьменнікаў і оперных кампазітараў. Але ўвесь свабодны час ён стараўся аддаць дзецям для таго, каб аблегчыць цяжар турботаў Марыі Апанасаўны, у якой праз два гады пасля Максіма, 14 лістапада 1894 года, нарадзіўся сын Лёва. Адам Ягоравіч часта браў дзяцей на прагулку ў поле, у лес, на Нёман. Цікава, што бацька паэта насіў малога Максіма за плячыма, такім чынам будучы паэт знаёміўся з горадам з вышыні немалога росту Адама Ягоравіча. Цяпер, калі прайшло шмат часу, цяжка ўявіць сабе, якое ўражанне на малога Максіма меў горад Гродна, але без сумнення такія здабыткі архітэктуры, як Стары і Новы замкі, Барысаглебская царква, Фарны, Брыгіцкі, Бернардынскі касцёлы і кляштар, Францысканскі касцёл, царква Нараджэння Багародзіцы і шмат іншых гістарычных месцаў горада пакінулі глыбокі след у душы паэта і далучыліся да яго вялікай любові да Радзімы.

---

1 Шлях паэта. Зборнік успамінаў. Мінск, 1975, с. 19.
2 Новы Свет—старая назва прывакзальнай часткі г. Гродна.
3 Вуліца Садовая перайменавана ў вуліцу імя М. Багдановіча.
4 Памятная книжка Гродненской губернии на 1892 г. — Гродно, 1892, с.14.
5 Народная бібліятэка—цяпер бібліятэка імя Я. Карскага.
6 А. Н. Бачыла. Дарогамі Максіма Багдановіча. Мінск, 1983, с. 28.

30 мая 1896 года ў сям ´і Багдановічаў нарадзілася дачка — Ніна, але радасць абярнулася горам, нараджэнне дачкі паспрыяла развіццю старой хваробы ў Марыі Апанасаўны — сухотаў. Развіццё хваробы ішло хутка і няўмольна: вёска, кефір, кваякол, кадэін — нічога не дапамагло. 4 кастрычніка 1896 года Марыі Апанасаўны не стала. Захавалася копія пасведчання за № 842: «Дадзена гэта ад Гродзенскага Сафійскага Сабора ў тым, што ў копіі метрычнай кнігі гэтага Сабора за 1896 г., у III частцы «аб памёршых» пад № 85 жаночага роду значыцца: 1896 г., кастрычніка, чацвёртага дня памерла ад скарацечных сухотаў жонка памочніка бухгалтара Гродзенскага аддзялення Сялянскага банка Адама Ягоравіча Багдановіча Марыя Панасаўна, 27 год ад нараджэння і шостага таго ж кастрычніка пахавана на гарадскіх могілках»[1]. Пахавана яна была на гродзенскіх праваслаўных могілках перад царквою, направа ад галоўных варот і дарогі ў царкву. Над яе магілай быў устаноўлены дубовы крыж, на якім напісана яе імя, дзень смерці і ўзрост.

Хутка пасля смерці жонкі Адам Ягоравіч быў пераведзены ў Ніжні Ноўгарад, куды ён і паехаў з сям ´ёй 25 кастрычніка 1896 года. Максім Багдановіч пакідаў гродзенскую зямлю, але памяць аб ім Гродна не пакінула і не пакіне ніколі.

Дом, дзе жыла сям ´я Багдановічаў у Гродне, да канца 70-х гадоў не з ´яўляўся гістарычным здабыткам, на ім толькі была ўстаноўлена мемарыяльная дошка, на якой было напісана, што з 1892 па 1896 гады тут жыў Максім Багдановіч. У гады Вялікай Айчыннай вайны, пасля акупацыі Гродна гітлераўскімі войскамі, у гэтым доме размяшчалася гасцініца для нямецкіх афіцэраў. Дом дзеля гэтага перабудавалі, але даваенны выгляд будынку ўвогуле захаваўся.

## 3. ДОМ-МУЗЕЙ ІМЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Ішоў 1981 год, год, які літаратары Беларусі назвалі «годам Максіма Багдановіча». Такім ён і быў сапраўды. Яшчэ з вясны пра паэта загаварылі газеты і часопісы, падключылася радыё і тэлебачанне, у школах, на заводах праходзілі вечары памяці Максіма Багдановіча. Да гэтага часу прыўрочана стварэнне дома-музея М. А. Багдановіча ў Гродна[2]. Афіцыйна ініцыятарам стварэння музея выступіў Навукова-метадычны цэнтр горада, але асноўная заслуга ў гэтым належыць людзям, закаханым у беларускую літаратуру і ў творчасць Максіма Багдановіча. Перш за ўсё трэба назваць імя беларускай паэтэсы Дануты Бічэль-Загнетавай, якая адначасова стала кіраўніком музея. Сярод актыўных удзельнікаў збору матэрыялаў трэба адзначыць Яўгена Шунэйку. Збор патрэбных матэрыялаў ішоў з 9 верасня 1981 года да вясны 1986 года. 16 мая 1986 года адбылося ўрачыстае адкрыццё дома-музея імя Максіма Багдановіча, які размясціўся ў тым самым доме, у якім на працягу чатырох гадоў жыла сям ´я паэта[3].

---

[1] Памятная книжка Гродненской губернии на 1896 г.—Гродно, 1896, с. 48.
[2] Маладосць, 1981, Дом і памяць, с. 96.
[3] Гродненская правда, 1986, 21 мая.

Экспазіцыя музея размешчана ў трох пакоях і доўгім калідоры дома. Першыя два стэнды апавядаюць аб бацьках паэта, дзіцячых гадах Максіма Багдановіча, сям 'і Багдановічаў. Захавалася некалькі сямейных фотакартак той пары, калі малы Максім ва ўзросце 7—8 месяцаў з бацькамі пераехаў з Мінску ў Гродна: маленькі паэт у кашульцы стаіць босымі ножкамі на стале. Каля стала побач з ім стаіць зусім маладая маці. Гэта фота зроблена, відаць, месяцы праз два пасля пераезду сям 'і ў Гродна. На другім фота, прыблізна таго ж часу, Марыя Апанасаўна сфатаграфавана са старэйшым сынам Вадзімам. На фота 1894 года бачым двух братоў — Вадзіма і Максіма. Яны трымаюцца за рукі. Максім нагадвае дзяўчынку. Маці вельмі хацела мець дачку і таму часта апранала яго ў сукенку. У канцы 1895 года, відаць, быў зроблены фотаздымак, на якім мы бачым Марыю Апанасаўну і Адама Ягоравіча з трыма дзецьмі — Вадзімам, Максімам і Лёвам. Лёва яшчэ маленькі, бацька трымае яго на руках. Далей матэрыялы музея апавядаюць пра гады, якія Максім правёў у гімназіі і ліцэі, ёсць рэдкія і каштоўныя дакументы, асабістыя кнігі паэта. Падрабязна адлюстравана грамадская дзейнасць Максіма Багдановіча, апавядаецца аб вядомых дзеячах беларускага рэвалюцыйнага руху. Спецыяльная частка экспазіцыі прысвечана беларускім пісьменнікам і паэтам, прысвяціўшым свае творы Максіму Багдановічу. У музеі ёсць сведчанне любові савецкіх людзей да паэта — гэта падарунак палярнікаў: рэдкі фотаздымак і друкаваны тэкст. Асобны пакой музея ўяўляе сабой рабочы кабінет Адама Ягоравіча, дзе можна ўбачыць стол, за якім ён працаваў, насценны гадзіннік і іншае. У гэтым пакоі і цяпер пануе паважны, навуковы дух. У трэцім пакоі дома прадстаўлены творы мастакоў і скульптараў Беларусі, прысвечаныя Багдановічу. Тут можна знайсці працы Алеся Ступеня, Віктара Ільіна, Валерыя Янушкевіча, Аляксандра Пашнева і іншых.

Ад самага стварэння музей вядзе актыўную працу. На працягу 1986—1991 гадоў яго наведалі тысячы людзей. Наведванне музея ў школах і інстытутах горада стала традыцыяй. Можна з задавальненнем сказаць, што дом-музей імя Максіма Багдановіча назаўсёды заняў ганаровае месца сярод культурных мясцін горада Гродна.

## 4. НІЖНІ НОЎГАРАД

У лістападзе 1896 года сям 'я Багдановічаў пераязджае на сталае жыхарства ў Ніжні Ноўгарад. Адам Ягоравіч пачынае працаваць бухгалтарам Ніжагародскага аддзялення Сялянскага банка. Да сям 'і далучаецца Марыя Ягораўна, родная сястра Адама, каб дапамагчы гадаваць асірацелых дзяцей. Распарадак жыцця ў Ніжнім такі ж прыкладна, як і ў Гродне: прагулкі ў сады, на Волгу і Аку—на ўлонне жывой прыроды. Бацька знаёміць дзяцей з жыццём вёскі, фабрычных і заводскіх цэнтраў, з помнікамі старажытнасці. Дзеці, у тым ліку і Максім, ездзілі на кумыс у Уфімскую і Самарскую губерні, а ў Крым адпачываць і лячыцца. Разам з тым гэта былі экскурсіі пазнавальнага характару: яны пашырылі ўяўленні аб людзях, гарадах і прыродзе, расла свядомасць дзяцей[1].

[1] М. М. Барстак. Максім Багдановіч у школе. Мінск, 1974, с. 11.

У лістападзе 1896 года Адам Ягоравіч знаёміцца з Максімам Горкім, які тады працаваў у рэдакцыі газеты «Нижегородский листок» і жыў на рагу вуліц Цялячай і Вазнясенскага завулка ў просценькім невялічкім доміку. З гэтай сустрэчы пачынаецца дружба тады яшчэ малавядомага літаратара Аляксея Максімавіча Пешкава з чыноўнікам Адамам Багдановічам — беларускім этнографам і гісторыкам. Праз тры гады сем 'і іх парадніліся. У 1899 годзе Адам Ягоравіч ажаніўся з роднай сястрой жонкі Максіма Горкага Кацярыны Паўлаўны — Аляксандрай Паўлаўнай Волжынай. Ды спакой і шчасце ў сям 'і Багдановічаў былі кароткія. Нарадзіўшы сына, Аляксандра Паўлаўна памерла ад родаў. Хлопчыка назвалі Аляксандрам, выхоўваць яго ўзялі да сябе Кацярына Паўлаўна і Аляксей Максімавіч. Але пражыў Шурык нядоўга. Ён памёр ад дызентэрыі, калі яму было 5 гадоў. Трэці раз Адам Ягоравіч ажаніўся з Аляксандрай Апанасаўнай Мякотай — сястрой сваёй першай жонкі Марыі Апанасаўны. З ёю ў Адама Ягоравіча было яшчэ пяць сыноў: Павел, Мікалай, Аляксей, Вячаслаў і Раман. Аляксандра Апанасаўна робіцца амаль што другой маці для Максіма, застаецца яго добрым таварышам на ўсё жыццё.

У 1901 годзе ў Ніжні Ноўгарад прыязджала з Беларусі хросная маці Максіма — Вольга Епіфанаўна Сёмава. Гэты прыезд даў моцны штуршок паэтычнай дзейнасці паэта.

У 1902 годзе Максім Багдановіч паступае ў першы клас Ніжагародскай мужчынскай гімназіі. Будынак гімназіі размяшчаўся на плошчы Мініна супраць Дзмітрыеўскай вежы Ніжагародскага крамля, цяпер гэта левае крыло прыгожага чатырохпавярховага корпуса педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. Але, на жаль, на будынку былой гімназіі і дагэтуль няма мемарыяльнай дошкі, гэта яшчэ трэба зрабіць.

У 1902 годзе Максім Багдановіч піша свае першыя вершы на беларускай мове, а ў 1907 годзе паэт дасылае ў газету «Наша Ніва» свой першы твор — лірычнае апавяданне «Музыка», якое было надрукавана 6 ліпеня[1]. Услед за сваім старэйшым братам Вадзімам ён цікавіцца палітыкай, прымае актыўны ўдзел у рабоце гімназічных гурткоў, у рэвалюцыйным руху, за што трапляе ў спісы палітычна ненадзейных.

## 5. У ЯРАСЛАЎЛІ

Неўзабаве сям 'ю напаткала новае няшчасце: услед за Нінай, якая памерла маленькай неўзабаве пасля пераезду ў Ніжні Ноўгарад, памірае ў 1908 годзе ад сухотаў васемнаццацігадовы Вадзім — старэйшы брат Максіма. У маі 1908 года Адам Ягоравіч перавозіць усю сям 'ю ў Яраслаўль. Пераезд гэты быў вымушаны, бо бацька паэта стаў перашкаджаць ніжагародскаму дваранству ў перадзеле зямлі, ды і смерць Вадзіма спрыяла пераезду — Багдановічы ўцякалі ад цяжкіх успамінаў.

---

[1] О. А. Лойка. Максім Багдановіч. Мінск, 1966, с. 5—35.

Пасля пераезду Максім працягвае сваю адукацыю ў Яраслаўскай гімназіі. Падчас вучобы жыццё паэта было спакойнае і даволі аднастайнае. Амаль ніхто ў яго не бываў. Ён жа сам або займаўся ў сваім пакоі, або сядзеў у Пушкінскай бібліятэцы, чытаючы новыя часопісы. Вясной 1909 года ў Максіма ўжо яскрава выяўляецца страшэнная хвароба — сухоты. Па парадзе ўрачоў Адам Ягоравіч вязе Максіма на лячэнне ў Ялту, у пансіён на малочнай ферме «Шалаш». Адтуль паэт вяртаецца значна здаравейшы. У 1911 годзе Максім Багдановіч скончыў Яраслаўскую гімназію. Будынак гімназіі, зроблены па старому звычаю з цёсанага камення, быў трохпавярховым, пафарбаваны ў белы колер. Цяпер у ім размясціўся Яраслаўскі тэхналагічны інстытут. Каля галоўнага ўваходу бачна мемарыяльная дошка, на якой напісана: «Здесь в 1908—1911 годах учился в мужской гимназии известный белорусский поэт Максим Богданович»[1].

На апошнія гімназічныя гады прыпадае пачатак кахання Максіма да Ані Кукуевай, якой ён прысвеціць сваю «Вераніку» і якой назаўсёды будзе належаць сэрца паэта[2].

Адразу пасля заканчэння гімназіі Максім Багдановіч ажыццяўляе сваю даўнюю мару і едзе да родных мясцін у Беларусь. У чэрвені 1911 года Максім прыбыў у Вільню. Пасля ціхага Яраслаўля, які прывольна раскінуўся на беразе магутнай Волгі, Вільня ўразіла Максіма кантрастам паміж старымі і новымі кварталамі горада. Яе вузкія, цесныя, крывыя і ціхія вулачкі са старажытнымі вежамі, і побач — новая мітуслівая Вільня напярэдадні першай сусветнай вайны: з вулічным натоўпам, стракатымі вітрынамі, з крамамі і банкамі. У Вільні Максім прабыў усяго два дні, начаваў у памяшканні рэдакцыі «Нашай Нівы», якая размяшчалася ў той час на Завальнай вуліцы, у доме № 7[3]. Ён марыў аб непасрэдных сустрэчах з беларускімі сялянамі, з людзьмі, што сваімі рукамі здабываюць хлеб, гавораць на жывой беларускай мове, пяюць дарагія яму матчыны песні. І вось два месяцы жыве ён у фальварку Ракуцёўшчына — маляўнічым кутку непадалёку ад Маладзечна. Вяртаецца Максім у Яраслаўль поўны ўражання ад роднага краю і з цвёрдым рашэннем вярнуцца на радзіму назаўсёды.

У 1911 годзе Багдановіч паступае на вучобу ў Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. На жаль, будынак ліцэя, які стаяў на Стрэнцы, непадалёку ад месца, дзе ў Волгу ўпадае рака Катарасль, не захаваўся да нашых дзён, як не захаваўся і будынак ліцэйскай бібліятэкі, дзе за кнігамі шмат часу правёў Максім.

У ліцэйскі перыяд працягваецца росквіт таленту паэта. Ён пачынае паэму «Вераніка», заканчвае цыкл вершаў «Старая спадчына». На старонках газеты «Наша Ніва», 1912 г., № 26, публікуецца цыкл вершаў аб гістарычным мінулым Беларусі («Летапісец», «Перапісчык», «Слуцкія ткачыхі» і інш.).

У 1914 годзе пачынаецца першая сусветная вайна, якая не абмінула і сям´ю Багдановічаў. Максіма не маглі прызваць у армію з-за хваробы, затое Лёва, які вучыўся тады ў Маскоўскім універсітэце, добраахвотна

[1] Шлях паэта. Зборнік успамінаў. Мінск, 1975, с. 35—43.
[2] М. Стральцоў. Загадка Багдановіча. Мінск, 1968, с. 75—96.
[3] Н. Б. Ватацы. Шляхі. Мінск, 1986, с. 66—72.

паступае ў Аляксандраўскае афіцэрскае вучылішча, потым трапляе на фронт. У час Брусілаўскага прарыву Лёва быў паранены разрыўной куляй у нагу, трапіў у Кіеўскі шпіталь, дзе і памёр.

## 6. ЗНОЎ У МІНСКУ

У 1916 годзе Максім Багдановіч, здаўшы апошнія залікі, заканчвае ліцэй. Збываецца яго мара — вярнуцца на Радзіму. Ён прыязджае ў кастрычніку ў Мінск і працуе ў губернскім харчовым камітэце, адначасова ўдзельнічае ў рабоце Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны. Камітэт дапамогі быў заснаваны восенню 1915 года падчас нямецкага наступлення, якое выклікала новую хвалю бежанцаў. Размяшчаўся камітэт у драўляным доме № 18 па Захар ´еўскай вуліцы[1]. Дом меў чатыры пакоі. У першым была сталоўка, у другім — канцылярыя камітэта. У гэтым доме Максім Багдановіч праводзіў шмат часу, робячы ўсё, каб дапамагчы бедным, абяздоленым людзям. Але ўвосень 1916 года стан здароўя паэта моцна пагоршыўся. Таварышы амаль што сілком прымусілі яго ехаць у Ялту. Два разы Максім пакідаў Мінск: першы раз — у дзіцячым узросце, калі бацька з-за хваробы і перамены месца працы павінен быў пераехаць з сям ´ёю ў Гродна, і другі раз — з-за сваёй хваробы, каб ехаць на лячэнне. Доўгім было яго другое развітанне. У свой родны горад вернецца ён толькі праз шэсцьдзесят чатыры гады: у 1980 годзе ў Мінску будзе ўстаноўлены помнік паэту. Ён уяўляе сабой бронзавую фігуру М. Багдановіча ва ўвесь рост са складзенымі на грудзях рукамі, выкананую па праекту аднаго з лепшых скульптараў Беларусі — С. Вакара[2].

## 7. ЯЛТА

Прыехаўшы ў Ялту, Максім Багдановіч доўга шукаў кватэру і нарэшце пасяліўся на вуліцы Мікалаеўскай[3], у доме № 8, гаспадыняй якога была Марыя Цямко. Дом гэты быў невялікім, двухпавярховым, адзін бок якога патанаў у засені густых кіпарысаў і дзікіх сліў. Пакой, у якім жыў паэт, быў даволі светлы і прасторны. Ля ўваходу направа калісьці стаяла вялікая печ, потым яе разабралі і паставілі невялікую пліту. Злева і насупраць у пакоі — два акна. З балкона раней быў добра бачны бераг, цяпер яго закрылі дрэвы. Тут, у гэтых сценах, смяротна хворы, бяссільны целам і моцны духам, дажываў паэт апошнія дні, заняты працай над складаннем беларускага буквара. Паміраў ён у адзіноце, далёка ад роднага краю, у тую пару года, калі ўсё квітнела ў Крыму, калі свежы вецер вялікіх перамен веяў над Расіяй. Паміраў ён з марамі пра лепшае будучае беларускага народа, з усведамленнем, што спаўна выканаў свой грамадзянскі абавязак.

Памёр Максім Адамавіч Багдановіч, калі яму было 25 гадоў 5 месяцаў і 16 дзён — 25 мая 1917 года (12 мая па ст. ст.). Пахавалі паэта

---

1 А. Н. Бачыла. Дарогамі Максіма Багдановіча. Мінск, 1983, с. 103.
2 Там жа, с. 19.
3 Вуліца Мікалаеўская перайменавана ў вуліцу Камунараў і зусім нядаўна — на Набярэжную Леніна.

непадалёку ад Мікалаеўскай вуліцы ў напрамку да гары, на самам канцы могілак, унізе, у трох сажанях ад ускрайку, з супрацьлеглага ад мора боку. У галаве магілы быў невялікі крыж з надпісам на бляшчанай табліцы: «Студент Максим Адамович Богданович»[1]. Месца магілы было дрэннае, ліўні і патокі з крутога схілу маглі размыць магілу.

Цяпер гэтыя мясціны выглядаюць інакш: на доме па вуліцы Мікалаеўскай у 1957 годзе была ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Інакш выглядае і магіла: яна абнесена жалезнай агароджай. На каменнай пліце страфа з вядомага «Санета»:

«Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзіла і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі».

А далей просты надпіс: «Беларускі паэт Максім Багдановіч. Нарадзіўся 27 лістапада 1891 г. у Мінску, памёр 12 мая 1917 г. у Ялце»[2]. Ля помніка нечай руплівай рукой пасаджаны кветкі, а побач з агароджай узвышаюцца прысадзістыя кіпарысы, падобныя на звычайныя беларускія ёлкі.

На крымскай зямлі ёсць яшчэ адзін помнік Максіму Багдановічу. Недалёка ад Ялты, у Верхнім Місхоры, перад прыгожым будынкам санаторыя «Беларусь» устаноўлены бюст беларускага паэта работы народнага мастака БССР З. Азгура.

## 8. МАКСІМАЎ САД

Ёсць яшчэ адзін незвычайны помнік Максіму Багдановічу. Вось як ён узнік. 24 красавіка 1981 года групу пісьменнікаў на чале з Нілам Гілевічам запрасілі жыхары Маладзечна на пасадку саду ў Ракуцёўшчыне, той Ракуцёўшчыне, у якой семдзесят гадоў назад амаль два месяцы жыў і тварыў паэт. Тут ім напісаны вялікі верш «У вёсцы», тут абдумваў і пачаў ён сваю «Вераніку».

Калі пісьменнікі прыехалі ў Ракуцёўшчыну, то былі прыемна здзіўлены. На некалі пустым пагорку высіўся памятны знак — камень-валун з прымацаванай да яго плітой, якая гаварыла, што сюды ўлетку 1911 года прыязджаў Максім Багдановіч. Устанаўленне памятнага знака — сведчанне любові да паэта. Гэта ж любоў падахвоціла іх і да закладкі саду.

Пісьменнікі разам з вучнямі Красненскай і Чыснецкай сярэдніх школ пасадзілі семдзесят дрэў — адзнака тых сямідзесяці гадоў, што мінулі з часу прыезду сюды паэта. Дамовіліся, што кожны год сад будзе папаўняцца новымі дрэвамі, пакуль не зойме увесь схіл пагорка.

І калі, закончыўшы працу, паэт Ніл Гілевіч запытаў: «А як жа мы яго назавём?» — ні ў кога не было іншых прапаноў, апрача гэтай, вельмі сціплай і дакладнай — Максімаў сад.

[1] Шлях паэта. Зборнік успамінаў.Мінск, 1975, с. 53.
[2] Там жа, с. 202.

Хай ён пакуль што невялікі — не бяда. З гадамі разрасцецца і высока ўскіне ў неба свае густыя кроны. І, можа, не раз прыляціць сюды яго «шэрая зязюля», каб сваім кукаваннем адлічваць ужо не сумныя, а радасныя падзеі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Бег часу адмятае ўсё дрэннае, фальшывае і толькі сапраўды добрае, шчырае, таленавітае застаецца і атрымлівае права жыць стагоддзямі. Хутка мы будзем святкаваць 100-годдзе з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, а яго творчыя дасягненні не толькі не страцілі мінулай прыгажосці і глыбокага сэнсу, але, наадварот, набылі незвычайную важнасць. Яны і цяпер валодаюць нашым сэрцам, вымушаючы любіць, любіць беларускую культуру, любіць беларускую мову, любіць Беларусь.

Дзякуй Вам, Максім Адамавіч!

1. Н. Б. Ватацы. Шляхі (гісторыка-літаратурныя артыкулы). Мінск, Мастацкая літаратура, 1986.

2. А. Н. Бачыла. Дарогамі Максіма Багдановіча. Мінск, Народная асвета, 1983.

3. Шлях паэта (зборнік успамінаў біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багдановіча). Мінск, Мастацкая літаратура, 1975.

4. М. М. Барстак. Максім Багдановіч у школе. Мінск, Народная асвета, 1974.

5. А. А. Лойка. Максім Багдановіч. Мінск, Навука і тэхніка, 1966.

6. С. Стральцоў. Загадка Багдановіча. Мінск, Беларусь, 1968.

7. З. Верас. Пяць месяцаў у Мінску. Літаратура і мастацтва, 1967, 29 верасня.

8. Матэрыялы дома-музея імя М. Багдановіча ў Гродне.

9. Памятные книжки Гродненской губернии за 1891—1896 гг. Гродно, 1891—1896.

10. Маладосць. 1981, с. 96.

11. Газета Гродненская правда, 1986, 21 мая.

[illegible]

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

[illegible]


1. А. В. Мальдзіс. [illegible]. Мінск, [illegible], 1982.

2. А. Е. [illegible] Максіма Багдановіча. Мінск, Народная асвета, 1983.

3. Шлях паэта. Зборнік успамінаў і матэрыялаў пра Максіма Багдановіча. Мінск, Мастацкая літаратура, 1975.

4. М. М. [illegible]. Максім Багдановіч у школе. Мінск, Народная асвета, [illegible].

5. [illegible]

6. [illegible]

СЯЛЬВЕРСТАВА С. Я.

# СТАРОНКІ З ЖЫЦЦЯ ГРОДНА Ў СЯРЭДЗІНЕ 90-х ГАДОЎ XIX СТАГОДДЗЯ

Пачатак жыццёвага шляху Максіма Багдановіча звязаны з Гродна, таму, менавіта, аматарам творчасці беларускага песняра будзе цікава даведацца, што ўяўляў сабой горад над Нёманам у час, калі тут жыла сям 'я Багдановічаў. Матэрыялы, якія прапануюцца чытачу, не прэтэндуюць на ўсеабдымнасць — мы паспрабавалі спыніцца толькі на тых з 'явах і падзеях у жыцці горада, якія так ці інакш закранай сям 'ю будучага паэта.

Адам Ягоравіч Багдановіч прыехаў у Гродна ў чэрвені 1892 года, у ліпені да яго прыехала Марыя Апанасаўна з дзецьмі. Сям 'я Багдановічаў жыла спачатку ў доме Марушэўскага на Новым Свеце (1892—1894 гг.)[1], затым у доме Агульніка таксама на Новым Свеце[2], а апошняя яе кватэра ў Гродна знаходзілася ў доме Шмідта на вуліцы Палявой[3].

Гродна ў той час быў адным з буйных гарадоў Беларусі. У пачатку 90-х гадоў тут пражывала амаль 50 тыс. чалавек[4]. Большасць з іх (каля 75%) складалі мяшчане — рамеснікі, дробныя гандляры, рабочыя прамысловых прадпрыемстваў. Вялікую частку насельніцтва горада складалі ваенныя (больш за 6, 7 тыс. чалавек)[5]. Гродна быў шматнацыянальным горадам: беларусы, яўрэі, рускія, палякі, татары, літоўцы жылі ў горадзе і навакольных вёсках.

Па ўзроўню развіцця прамысловасці Гродна займала у Беларусі прыкметнае месца: у 90-я гады тут дзейнічала 13 буйных прадпрыемстваў[6], сярод якіх вылучалася тытунёвая фабрыка Шарышэўскага, дзе было занята 1,5 тысячы чалавек[7].

Горад пачаў хутка расці пасля адмены прыгоннага права: за трыццаць гадоў колькасць яго насельніцтва павялічылася больш чым у два разы[8]. Нават буйны пажар, які знішчыў у 1885 годзе амаль палавіну

---

[1] Бічэль-Загнетава Д. І. Пошукі Максіма Багдановіча // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства: Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі — Гродна, 1990.— С. 12.
[2] Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год.— С. 208.
[3] Бічэль-Загнетава Д. І. Указ. твор.— С. 13.
[4] Памятная книжка Гродненской губернии за 1892 год.— С. 18.
[5] Там жа.
[6] Абезгауз З. Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века. Минск, 1871.—С. 60.
[7] Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год. С. 26.
[8] З 20 тыс. чалавек у 1861 годзе / Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX века. — Мн., 1987.— С. 31/да 50 тыс. у 1891.



847411
Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

Гродна, не мог спыніць яго рост. Не апошнюю ролю ў хуткім развіцці горада адыграла будаўніцтва чыгункі, якое пачалося ў 1862 годзе, калі праз Гродзенскую губерню прайшла Пецярбурга-Варшаўская чыгунка — невялікі адрэзак даўжынёю ў 50 вёрст. У час, калі ў Гродна пасялілася сям 'я Багдановічаў (дарэчы, непадалёку ад чыгуначнай станцыі), з Гродна можна было даехаць чыгункай не толькі да Вільні, Варшавы і Пецярбурга, але дзякуючы лініі Беласток — Баранавічы (пабудавана ў сярэдзіне 1880-х г.[1]) трапіць на Маскоўска-Брэсцкую, Кіева-Брэсцка-Граеўскую і іншыя лініі[2]. Такім чынам, Гродна было злучана з буйнейшымі цэнтрамі Расійскай імперыі праз разгалінаваную сетку чыгуначных шляхоў. Як і ў іншых гарадах, праз якія праходзіла чыгунка, гарадская забудова тут хутка разрасталася, у яе сферу ўключаліся новыя раёны, не толькі Новы Свет, дзе жыла сям 'я Багдановічаў, але і іншыя — Пагулянка, Занёманскі фарштат. Павялічвалася колькасць паверхаў у дамах, шчыльней забудоўваліся вуліцы. У сувязі з гэтым паўстала пытанне аб ўладкоўванні гарадской забудовы, наданні ёй больш планамернага характару. У 1874 годзе быў распрацаваны план рэканструкцыі горада, які прадугледжваў узбуйненне кварталаў, спрамленне вуліц, утварэнне зялёных санітарных зон. Гэтыя задумкі засталіся на паперы. Але некаторыя мерапрыемствы ўсё ж такі ўдалося ажыццявіць, найбольш важным з іх было будаўніцтва вадаправоду, якое пачалося ў 1876 годзе[3].

Нягледзячы на значнае развіццё прамысловасці (у 1894 годзе ў Гродзенскай губерні было выраблена прамысловай прадукцыі на 12,85 млн. рублёў — першае месца сярод губерняў Беларусі[4]), вядучую ролю ў эканоміцы краю адыгрывала сельская гаспадарка. Сялянскае насельніцтва губерні складала ў 1892 годзе 958,8 тысячы чалавек[5]. Заходнія губерні вылучаліся сярод іншых губерняў Беларусі больш высокім узроўнем развіцця капіталістычных адносін, больш выразнай спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі. Добрыя кліматычныя ўмовы спрыялі развіццю земляробства, але дрэнныя глебы вымушалі сялян абмяжоўвацца пасевамі жыта, аўса, ячменю. Галоўнай жа сельскагаспадарчай культурай з 40-х гадоў XIX стагоддзя была бульба. Ураджаі былі не вельмі вялікія: збожжа — сам-чатыры; бульбы — сам-шэсць[6]. Яшчэ з часоў Валочнай памеры канца XVI стагоддзя ў Віленскай, Гродзенскай, частцы заходніх уездаў Мінскай губерні не было сялянскай абшчыны, а існавала падворнае землекарыстанне. У сувязі з гэтым адмена прыгоннага права праводзілася тут іншым чынам, чым ва ўсходніх губернях Беларусі. У час паўстання 1863 года царскі ўрад павінен быў пайсці на ўступкі — быў ліквідаваны часоваабавязаны стан, сяляне павінны былі выкупіць зямлю, якую атрымалі ў час рэформы, а плата за

---

[1] Абезгауз З. Е. Указ. твор. С. 61.
[2] Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.—С. 10.
[3] Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии.— Мн., 1985.— С. 281—282.
[4] Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год. С.10.
[5] Памятная книжка Гродненской губернии за 1892 год. С. 30.
[6] Там же. —С.16.

яе паніжалася на 20%. Былі таксама часткова вернуты землі і сервітуты, адабраныя шляхтай у сялян напярэдадні рэформы. Усё гэта абумовіла хуткае развіццё сельскай гаспадаркі ў рэгіёне па шляху капіталізма ў параўнанні з іншымі губернямі Беларусі. Згодна з «Усталяваннем», па якому праводзілася надзяленне сялян зямлёй, у сярэднім адна сялянская гаспадарка атрымала 21,5 дзесяцін зямлі (для сярэдняй сялянскай сям'і, каб яна магла існаваць, неабходна было не менш як 15 дзесяцін добрай зямлі)[1]. Але сялянскія сем'іраслі, фонд зямлі ў губерні адсутнічаў, што прыводзіла ўрэшце да малазямелля. У пераважнай большасці сялянскіх гаспадарак Гродзеншчыны на кожнага члена сям'і прыходзілася ў сярэднім 1,45 дзесяціны[2]. Развіццю сялянскай гаспадаркі перашкаджала і цераспалосіца. У Гродзенскай губерні сялянскія надзелы часам выцягваліся ў даўжыню на некалькі вёрст, звужваючыся да двух-трох аршынаў у шырыню[3]. У гэтых умовах сяляне вымушаны былі або пазбаўляцца надзелаў і ісці шукаць шчасця ў горад, або дакупляць зямлю.

Каб аблегчыць сялянству магчымасць продажу і куплі зямлі, у 1882 годзе быў створаны Сялянскі пазямельны банк. Гродзенскае аддзяленне банка, у якім працаваў бацька будучага паэта, пачало сваю дзейнасць у 1885 годзе[4]. Да 1896 года яно размяшчалася ў доме Рэйнгарта на Гарохавай вуліцы[5], а затым было перанесена на вуліцу Гараднічанскую ў дом Ашкеназе[6]. Старшынёй Гродзенскага аддзялення і непасрэдным начальнікам Адама Ягоравіча быў Павел Міхайлавіч Дзікаў — асоба цікавая і дастаткова вядомая ў горадзе. Стацкі саветнік, маёр у адстаўцы, за плячыма якога былі Рышэльеўскі ліцэй, Мікалаеўская акадэмія Генеральнага штаба; кавалер ордэнаў і медаляў, удзельнік падаўлення паўстання ў Венгрыі ў час «вясны народаў» і Крымскай вайны[7], П. М. Дзікаў у Гродне захапіўся краязнаўствам, зборам статыстычных матэрыялаў. Дарэчы, апошняе ўваходзіла ў склад яго службовых абавязкаў у час працы на пасадзе сакратара губернскага статыстычнага камітэта. У 1882—1890 гг. у Гродне былі надрукаваны дзве яго працы: «Сведения о лесах Гродненской губернии, собранные губернским статистическим комитетом в 1882 г.» і «Список землевладений в Гродненской губернии»[8].

А. Я. Багдановіч служыў у банку на пасадзе памочніка бухгалтара[9]. У яго абавязкі ўваходзіла ацэнка зямельных надзелаў, прызначаных на продаж або здачу ў залог, афармленне пазыкі, акрэсленне сумы працэнта і г. д. Дарэчы, працэнты, якія браў банк за пазыку грошай, былі

---

1 Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990.— С. 89.
2 Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.— С. 63.
3 Панютич В. П. Указ. соч.— С. 99..
4 Крестьянский поземельный банк // Брокгауз и Ефрон.— Т. 4 — С. 927.
5 Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год.— С. 60.
6 Бінэль-Загнетава Д. І. Указ. твор.— С. 13.
7 Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.— С. 39.
8 Нечухрин А. Н. Историки Гродненщины.— Гродно, 1989.— С.21—22, 25.
9 Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.— С. 39.

даволі высокія — ад 6,5 да 8,5%. Селянін мог узяць пазыку на 24,5 або на 34,5 гадоў[1]. Аб памерах дзейнасці Гродзенскага аддзялення Сялянскага банка сведчаць наступныя лічбы: за 1891—1894 гады (час, калі тут працаваў Адам Ягоравіч) сяляне купілі больш як 39 тысяч дзесяцін зямлі (дзесяціна — прыблізна 1,45 га), у 1894 годзе была выдадзена 41 пазыка на суму 111,8 тысячы рублёў, а зямлю купілі 494 селяніна[2]. Зямля каштавала дорага — больш як 50 рублёў за дзесяціну (для параўнання: 1 чвэрць жыта — каля 120 кг — каштавала ў 1891 годзе 8 рублёў 73 3/4 капейкі[3]), таму часта сяляне вымушаны былі купляць зямлю ў калектыўнае карыстанне, усёй грамадой. У 1895 годзе банк атрымаў дазваленне купляць і прадаваць памешчыцкую зямлю, быў паніжаны працэнт за пазыку. Год ад году абароты Сялянскага банка ўзрасталі. У сярэдзіне 90-х гадоў колькасць зямлі, купленай сялянамі пры дапамозе банка, у параўнанні з 80-мі гадамі павялічылася ў 20 разоў[4].

Праца А. Я. Багдановіча ў Сялянскім пазямельным банку давала яго сям'і сродкі для жыцця, але не толькі гэта. Дзякуючы сваёй пасадзе Адам Ягоравіч штодзённа сутыкаўся з сялянскім побытам, службовыя паездкі дазвалялі рабіць цікавыя этнаграфічныя назіранні. Невыпадкова менавіта ў гэты час убачылі свет дзве яго работы: «Пра паншчыну» (Гродненские губернские ведомости. 1894. № 10, 11, 16) і грунтоўнае даследванне па этнаграфіі «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (Гродна, 1895)[5]. Апошняя праца была складзена на падставе матэрыялаў, якія А. Я. Багдановіч сабраў на тэрыторыі Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў, але падрыхтоўка іх да друку, апрацоўка былі зроблены ў Гродне.

У канцы XIX стагоддзя Гродна быў адным з буйных культурных цэнтраў Беларусі. Тут працавала 69 навучальных устаноў (2 гімназіі, 4 уезныя прыхадскія вучылішчы, адно яўрэйскае пачатковае вучылішча, 52 пачатковыя яўрэйскія школы, рамеснае вучылішча, павівальная школа і іншыя[6]. У губерні дзейнічалі 18 друкарань і літаграфій, выдаваліся «Гродненские губернские ведомости», працавалі 12 кнігарняў і 10 невялікіх кніжных лавак[7], кожны сезон гродзенская публіка мела магчымасць наведваць тэатр, бываць на канцэртах музыкантаў, якія часта наведвалі Гродна ў гэты час.

Адам Ягоравіч і Марыя Апанасаўна прымалі самы актыўны ўдзел ва ўсіх найбольш важных падзеях культурнага жыцця горада. Многа сіл і вольнага часу аддаў А. Я. Багдановіч Гродзенскай публічнай бібліятэцы. Гэтая самая буйная ў губерні бібліятэка заснавана ў 1863 годзе, калі ў яе

---

1 Крестьянский поземельный банк // Брокгауз и Ефрон.— С. 927.
2 Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год.—С. 64—65.
3 Памятная книжка Гродненской губернии за 1892 год.— С. 36.
4 Панютич В. П. Указ. соч.— С. 116.
5 Багдановіч Адам Ягоравіч // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл.— Мн.: БелСЭ, 1986.— С. 45.
6 Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год.— С. 18.
7 Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.— С. 30.

фондах было больш як 7 тысяч тамоў (3977 перыядычных выданняў і 3101 асобны твор)[1], у 1894 годзе бібліятэка мела 41 гадзічнага члена, 719 месячных падпісчыкаў, 5153 сталых наведвальнікаў чытальнай залы[2]. Дзейнасць публічнай бібліятэкі праводзілася згодна з прынятымі ўрадам у 1884 годзе «Часовымі правіламі», а таксама статутам. Нагляд за дзейнасцю бібліятэкі, як і іншых публічных бібліятэк у Расійскай імперыі, ажыццяўляўся Міністэрствам народнай асветы і Міністэрствам унутраных спраў. Дарэчы, пачынаючы з сярэдзіны 80-х гадоў гэты нагляд асабліва ўзмацніўся. Штогод выдаваліся спісы кніг, іншых друкаваных твораў, якія здаваліся ўраду палітычна небяспечнымі і якія не павінны былі трапіць у публічныя бабліятэкі[3]. Практычна нагляд за дзейнасцю бібліятэкі ажыццяўляўся шляхам прызначэння ў склад бібліятэчнага савета прадстаўніка ўлад. У Гродзенскай публічнай бібліятэцы членам савета па прызначэнню губернатара быў дырэктар Гродзенскай класічнай гімназіі А. Д. Смародскі[4]. Сродкі бібліятэкі складаліся са штогадовых членскіх узносаў, платы з падпісчыкаў і добраахвотных ахвяраванняў кнігамі і грошамі ад розных рэдакцый і прыватных асоб. Гэтымі сродкамі, а таксама камплектаваннем кніжнага фонду, бібліяграфічнай працай ведаў савет бібліятэкі. Ён распараджаўся і штогадовай урадавай субсідыяй памерам у 800 рублёў, якая выдавалася на патрэбы бібліятэкі[5]. У склад савета, акрамя А. Я. Багдановіча і А. Д. Смародскага, уваходзілі рэвізор Гродзенскай кантрольнай палаты І. П. Волкаў і выкладчык Гродзенскай гімназіі Я. Ф. Арлоўскі[6]. Асаблівую цікавасць з вышэй названых калег А. Я. Багдановіча па бібліятэчнаму савету выклікае асоба Я. Ф. Арлоўскага — вядомага гісторыка і краязнаўцы.

Лёс А. Я. Багдановіча і Я. Ф. Арлоўскага быў шмат у чым падобны. Яны былі амаль аднагодкі — Адам Ягоравіч нарадзіўся ў 1862, Яўстафій Філарэтавіч — у 1863 годзе. Першы быў сынам прыгоннага селяніна і толькі дзякуючы рэформе 1861 года змог атрымаць адукацыю — скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Другі — сын свяшчэнніка — таксама «вучыўся на медныя грошы». Дзякуючы здольнасцям і руплівай працы скончыў спачатку Віленскае духоўнае вучылішча, Літоўскую духоўную семінарыю, а затым — Пецярбургскі гісторыка-архіўны інстытут. І Адам Ягоравіч, і Яўстафій Філарэтавіч працавалі на ніве адукацыі: першы да прыезду ў Гродна настаўнікам у Ігуменскім павеце, а пазней загадчыкам гарадскога пачатковага вучылішча ў Мінску; другі ўсё жыццё звязаў з Гродзенскай мужчынскай гімназіяй і адначасова выкладаў у жаночай Марыінскай гімназіі. Блізкімі і ўзаемадапаўняючымі былі іх захапленні — этнаграфія і фалькларыстыка ў Адама Ягоравіча і гісторыя і краязнаўства ў Яўстафія Філарэтавіча. І адзін, і другі ў той час

---

1 Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.—С. 30.
2 Бічэль-Загнетава Д. І. Указ. твор.— С. 13.
3 Цыбуля В. А. Грамадскія і спецыяльныя бібліятэкі Беларусі (XIX—пач. XX ст.) // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі — 1976 — № 2 — С. 31.
4 Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год — С. 45.
5 Памятная книжка Гродненской губернии за 1894 год.—С. 30.
6 Памятная книжка Гродненской губернии за 1896 год.— С. 45.

толькі пачыналі сваю працу па вывучэнню краю, дзе нарадзіліся і жылі. Бясспрэчна, гэта сяброўства і супрацоўніцтва ў бібліятэчным савеце было плённым як для А. Я. Багдановіча, так і для Я. Ф. Арлоўскага[1].

А. Я. Багдановіч і Я. Ф. Арлоўскі — яшчэ адна падобная рыса — былі агентамі Таварыства драматычных пісьменнікаў і оперных кампазітараў. Удзел іх у гэтым таварыстве не быў выпадковым — Гродна у той час было адной з тэатральных сталіц Паўноча-Заходняга краю, і таму паведамленні аб тэатральным жыцці горада над Нёманам маглі быць цікавымі для членаў таварыства. Таварыства было створана ў 1874 годзе ў Маскве з мэтай абароны матэрыяльных інтарэсаў драматургаў. У 1877 г. у склад яго ўвайшлі і оперныя кампазітары. Ініцыятыва стварэння таварыства належала групе драматургаў на чале з А. М. Астроўскім, які быў яго старшынёй да апошніх дзён жыцця. У час, калі агентамі таварыства сталі А. Я. Багдановіч і Я. Ф. Арлоўскі, старшынёй яго з ´яўляўся вядомы акцёр і драматург А. І. Сумбатаў-Южын. Сярод членаў Таварыства драматычных пісьменнікаў і оперных кампазітараў былі ў розныя часы такія вядомыя майстры, як І. С. Тургенеў, А. К. Талстой, М. А. Някрасаў, М. Е. Салтыкоў-Шчадрын, А. П. Чэхаў, А. М. Горкі, П. І. Чайкоўскі, П. М. Мусаргскі і іншыя. Таварыства арганізоўвала вечары, праводзіла конкурсы, выдавала Каталогі п ´ес членаў таварыства. Дарэчы, адзін з гэтых Каталогаў быў выдадзены ў час, калі агентамі таварыства былі гродзенцы — у 1895 годзе[2].

Горад Гродна ляжаў на вельмі зручным для тэатральных калектываў і асобных артыстаў месцы — праз яго праходзілі шляхі з Пецярбурга і Масквы ў Заходнюю Еўропу, у паўночныя і заходнія губерні Расійскай імперыі. У той час, калі ў Гродна прыехала сям ´я Багдановічаў, тут былі адчынены два тэатральныя будынкі, між іншым — непадалёку ад раёна, дзе пасяліліся Адам Ягоравіч і Марыя Апанасаўна з дзецьмі. Першы з іх — Гарадскі тэатр[3] — быў пабудаваны яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя і знаходзіўся побач з губернатарскім палацам, другі — драўляны Летні тэатр «весьма приличный, даже не без претензий на стильность»[4] пабудаваны ў 1890 годзе антрэпрэнерам М. Перлавым і ў наступным годзе перададзены ім гродзенскаму хрысціянскаму дабрачыннаму таварыству — знаходзіўся непадалёку ад першага ў гарадскім парку (былы батанічны сад)[5]. У 1892—1896 гадах ў тэатрах ігралі трупы М. Перлава, К. Корбіна, Р. Крамеса, таварыства акцёраў пад кіраўніцтвам А. Шчарбакова, В. Власава, С. Чупрова, Г. Фядотавай[6]. У складзе гэтых труп выступала некалькі выдатных рускіх акцёраў. У летнія

---

1 Падрабязней аб жыцці і дзейнасці Я. Ф. Арлоўскага можна даведацца: Нечухрин А. Н. Указ. соч.— С. 19—21.
2 Общество русских драматических писателей и оперных композиторов // Театральная энциклопедия. — Т. 4.— М., 1965.— С. 126—127.
3 Сёння — Гродзенскі тэатр лялек.
4 Театр и искусство.— 1902— № 40.
5 Пашкин Ю. А. Русский драматический театр в Белоруссии XIX века.— Мн, 1980— С. 43.
6 Пашкин Ю. А. Указ. соч. — С. 205—206.

месяцы 1892 года, калі Адам Ягоравіч і Марыя Апанасаўна прыехалі ў Гродна, на сцэне Летняга тэатра з вялікім поспехам іграў Павел Мікалаевіч Арленеў — тады яшчэ пачынаючы акцёр, а ў далейшым адна з зорак рускай сцэны, тэатральны педагог, сябра Л. М. Талстога. Гастролі Арленева ў Гродна пачаліся ў красавіку 1892 года, а 14 ліпеня П. Арленеў сыграў сваю апошнюю ў час выступленняў на гродзенскай сцэне ў гэты сезон ролю — Эспера ў п ´есе Пацехіна «Пакутнікі кахання»[1]. Сярод іншых акцёраў, ігру якіх маглі бачыць Багдановічы на гродзенскай сцэне, вылучаюцца А. Л. Вішнеўскі, у будучым — заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР (летні сезон 1895 года), вядомы трагік, папулярны і таленавіты артыст К. А. Гарын (летні сезон 1895 года)[2]. На сцэне тэатра ішлі п ´есы рускіх драматургаў, ставіліся творы замежных класікаў. Дарэчы, рэпертуар гродзенскай сцэны заўсёды вылучаўся добрым падборам п ´ес; антрэпрэнеры, паважаючы старыя тэатральныя традыцыі горада над Нёманам і ўлічваючы патрабавальнасць мясцовай публікі, звярталіся да высокамастацкіх твораў, хаця не абміналі і модныя ў тыя часы меладрамы і вадэвілі. Сваю ролю ў фарміраванні тэатральнай культуры горада ігралі «Гродненские губернские ведомости»: ніводная значная падзея тэатральнага жыцця Гродна не выпадала з поля бачання супрацоўнікаў і карэспандэнтаў газеты. Між іншым, «Гродненские губернские ведомости» адыгралі і асаблівую ролю ў жыцці сям ´і Багдановічаў.

«Гродненские губернские ведомости» пачалі выдавацца ў 1838 годзе. Першапачаткова газета друкавала толькі афіцыйныя матэрыялы, але пазней пачала друкавацца неафіцыйная частка, дзе былі матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, рэцэнзіі на спектаклі, літаратурныя творы. У перыяд, калі ў Гродне жыла сям ´я будучага паэта, рэдактарам «Гродненских губернских ведомостей» быў Канстанцін Дзмітрыевіч Давыдовіч[3]. Зусім нядаўна гродзенскім краязнаўцам удалося высветліць, што менавіта К. Д. Давыдовіч быў хросным бацькам дачкі Багдановіча Ніны. Сяброўства Багдановічаў з Давыдовічам паўплывала, хутчэй за ўсё, на з ´яўленне ў «Гродненских губернских ведомостях» артыкулаў А. Я. Багдановіча — «Пра паншчыну», рэцэнзіі на паэму «Тарас на Парнасе» (1893, № 19)[4], апавядання М. А. Багдановіча «Накануне рождества» (1893, № 102)[5].

Максім Багдановіч правёў у горадзе над Нёманам самыя першыя гады свайго жыцця, тут ён вучыўся хадзіць, размаўляць на роднай мове, упершыню адкрываў для сябе навакольны свет. Гродна было калыскай будучага паэта, а дзіцячыя назіранні, як сцвярджаюць старыя людзі, самыя яскравыя і застаюцца на ўсё жыццё...

---

[1] Пашкин Ю. А. Указ. соч.— С. 143—144.
[2] Там жа.— С. 141, 144—145.
[3] Бічэль-Загнетава Д. І. Указ. твор.— С. 13. Па матэрыялах А. П.Госцева.
[4] Госцеў А. П. Вяртанне мінулага // Там жа.— С. 22.
[5] Там жа.

# СПІС АСНОЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ МАКСІМУ БАГДАНОВІЧУ

**(Да 100-годдзя з дня нараджэння)**

Складальнікі: кандыдаты гістарычных навук Паўлючэнка Н. У., Палуцкая С. В., Сяльверстава С. Я.

Адамович Г. Мадонны: Опыт литературно-психологического исследования (творчества М. Богдановича) Неман. — 1986 г.— № 3. С. 154—161.

Алейнікава Э. А. Паэзія М. Багдановіча ў творчасці беларускіх кампазітараў // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук.— 1988 — № 6. С. 89—96.

Багдановіч М. Збор твораў у двух тамах. — Навука і тэхніка, 1968.—310 с.

Багдановіч М. Вянок: Кн. выбр. вершаў — Мінск: Мастацкая літаратура. 1985.— 121 с.

Багдановіч Максім Адамавіч // БелСЭ.— Мінск, 1970.— Т. 2— С. 60.

Багдановіч Максім Адамавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: — у 5-і т. Т. 1.— Мінск: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1984.— С. 255—257.

Богданович Максим Адамович // Белорусская ССР: Краткая энциклопедия. В 5-и т. Т. 5. Биографический справочник.— Минск: Бел. Сов. Энциклопедия, 1981. — С. 64—65.

Багдановіч і Лермантаў. Пра свабоду і неабходнасць // Бярозкін Г. Свет Купалы.— Мінск, 1981.— С. 408—425.

Барсток М. Максім Багдановіч у школе. Мн., 1974—96 с.

Барсток М. Максім Багдановіч. Нарыс аб жыцці і творчасці.— Мінск: Вучпедвыдав. БССР, 1961.— 54 с. /ёсць бібліяграфічныя артыкулы/.

Бачыла А. Дарогамі Максіма (Жыццёвы і творчы шлях Максіма Багдановіча). Мн., 1971 — 64 с.

Бачыла А. Дарогамі Максіма Багдановіча.— 2-е выданне. — Мінск: Народная асвета, 1983.— 104 с.

Бачыла А. М. Крыло непакою: Пошук, палеміка, успаміны.— Мінск: Мастацкая літаратура, 1985.— 268 с.

Белая С. «Шмат у жыцці ёсць дарог... » (Аб знаходжанні М. Багдановіча ў Яраслаўлі) — «Чырвоная змена» — 1987 — 21 лістапада.

Бярозкін Г. Купала, Багдановіч, руская паэзія // Полымя — 1972— № 2 — С. 169—191.

Бярозкін Г. С. Чалавек напрадвесні: Расказ пра М. Багдановіча.— Мінск: Народная асвета, 1986 г.— 175 с.

Васільева В. Максім Багдановіч і музыка (У дапамогу настаўніку) // Народная асвета. 1986 — № 3 — С. 54—58.

Ватацы Н. «А сэрца ўсё імкне да бацькоўскага краю...» /Маладосць — 1981 — № 6 — С. 171—178.

Ватацы Н. Максім Багдановіч. Паказальнік твораў, аўтарэфератаў і крытычнай літаратуры.— Мінск, 1977.— 254 с.

Ватацы Н. Б. Шлях: Гісторыка-літаратурныя артыкулы.— Мінск: Мастацкая літаратура, 1986.— 173 с.

Войтенков Н. Калугин С. Крымское лето Максима Богдановича. Неман// — 1980 — № 3 — С. 168—172.

Гілевіч Н. Слова пра Максіма Багдановіча // Полымя — 1982 — № 3 — С. 188—193.

Гринчик Н. М. М. Богданович // История Белорусской дооктябрьской литературы.— Минск, 1977.— С. 577—600.

Грынчык М. Максім Багдановіч і народная паэзія.— Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1963.— 210 с.

Звезда поэта (К 100-летию со дня рождения Максима Богдановича) // Гродненская правда.— 1991 — 2 апреля.

Зубараў Л. Максім Багдановіч, Мн., 1989 — 263 с.

Зубарев Л. И. Крик буревестника. Историко-документальная повесть о М. Горьком и Богдановичах. Мн., 1989—326 с.

Кабаковіч А. К. Паэзія М. Багдановіча.— Мінск: Навука і тэхніка, 1978.— 136 с.

Каваленка В. В. Максім Багдановіч і пошукі рускай паэзіі пачатку XX стагоддзя // Весн. Беларус. ун-та. Сер. 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія.— 1986 — № 3 — С. 3—5.

Казакоў М. Аб белым доме ля сіняй бухты (Да знаходжання М. Багдановіча ў Ялце) // Літаратура і мастацтва — 1989—29 верасня.

Лойка А. А. Максім Багдановіч.— Мінск: Навука і тэхніка, 1966—335 с.

Лойка А. А. Максім Багдановіч // Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. У 2 ч. Ч. 2: Падруч. для філал. фак. ВНУ — 2-е выд. дапрац. дап.— Мінск: Выш. шк., 1989. С. 298—350.

Майсейчык А. Л. Максім Багдановіч і беларускі казачны эпас // Беларуская літаратура.— 1990 — Вып. 18.— С. 49—57.

Майхровіч С. Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць.— Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1958.— 202 с.

Мачульскі А. Апіс рукапісаў М. Багдановіча і матэрыялаў да яго біяграфіі. Мн., 1929—400 с.

Мікута В. Яраслаўскае акружэнне Максіма Багдановіча // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. /Уклад. Г. Кісялёў.— Мінск: Мастацкая літаратура, 1990 — С. 181—186.

Мушынскі М. Максім Багдановіч — крытык і гісторык літаратуры // Полымя, 1985 — № 9 — С. 202—215.

Нікалаева Э. А. Музычныя аспекты паэзіі Максіма Багдановіча // Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук.— 1986 — № 2 — С. 78—86.

Нісневіч М. Багдановіч і музыка // Полымя — 1969 — № 10 — С. 185—196.

Откроем нежности сердца (К 100-летию М. Богдановича) // Советская Белоруссия — 1991—2 апреля.

Панова В. Где же архив Максима-Книжника? (О поисках белорусского поэта М. Богдановича) // Неман — 1984 — № 7 — С. 147—152.

Садоўская М. Лермантаў і Багдановіч // Народная асвета — 1964 — № 10 — С. 83—86.

Скалабан В. В это суровое и важное время: Максим Богданович в Минске (к биографии белорусского поэта) // Неман — 1981 — № 12 — С. 141—149.

Содаль У. Крупінкі (Зоська Верас аб Максіме Багдановічы) // Полымя — 1988 — № 12 — С. 199—206.

Стральцоў М. Загадка Багдановіча.— Мінск: Беларусь, 1968.— 120 с.

Стрельцов М. От Максима-Книжника начало // Неман — 1969 — № 5 — С. 79—109.

Узнясенскі А. Паэтыка М. Багдановіча. Коўна, 1926—50 с.

Хадкевіч Л. Да адкрыцця Літаратурнага музея Максіма Багдановіча // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. / Уклад. Г. Кісялёў.— Мінск: Мастацкая літаратура, 1990 — С. 359—360.

Чырскі М. А. Максім Багдановіч у Мінску. Мн. 1986—32 с.

Шалемава А. А. Пушкінскія традыцыі ў паэзіі М. Багдановіча // Весн. Беларус. ун-та.— Сер. 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія.— 1980 — № 2 — С. 14—17.

Шлях паэта. Зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М. Багдановіча.— Мінск: Мастацкая літаратура, 1975.— 319 с.

Эстетические взгляды М. А. Богдановича // Дорошкевич Э., Конон В. Очерки истории эстетической мысли Белоруссии.— М., 1972.— С. 285—298.

## ЗМЕСТ

ст.

УСТУП . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Балбатун А. А. Помнікі і памятныя месцы, звязаныя з жыццём і творчасцю беларускага паэта Максіма Багдановіча. . . . . . . . . 5

Уступ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
1. Нараджэнне Максіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
2. У Гродне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
3. Дом-музей імя Максіма Багдановіча . . . . . . . . . . . . . 9
4. Ніжні Ноўгарад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
5. У Яраслаўлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
6. Зноў у Мінску . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
7. Ялта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
8. Максімаў сад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Заключэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

Сяльверстава С. Я. Старонкі з жыцця Гродна ў сярэдзіне 90-х гадоў XIX стагоддзя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

Спіс асноўнай літаратуры, прысвечанай М. Багдановічу. . . . . . 27

247411

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

Падпісана да друку 5. VIII-1991 г.
Фармат паперы 60 х 84 1/16, 2 друк. арк.
Заказ 4691. Тыраж 800 экз.

ГАУД, вул. Паліграфістаў, 4

Бел 2005
B0000001442624